***Дзеепрыметнік** (тэставыя заданні, 7 клас) **I варыянт***

*1.На аснове якіх прымет можна сцвярджаць, што слова* ***пажаўцелы*** *з'яўляецца дзеепрыметнікам?*

а) адказвае на пытанні *які*?

б) абазначае прымету прадмета;

в) мае прыстаўку *па-*;

г) абазначае прымету прадмета паводле дзеяння.

2. Вызнач суадносіны слоў

| | |
|---|---|
| спалены | прыметнік |
| паліць | дзеепрыметнік |
| чырвоны | дзеяслоў |

*3.Адзначце словазлучэнні "дзеепрыметнік + назоўнік":*

а) роўненькая дарога;

б) казачны домік;

в) выраўненая лінія;

г) чарнявы хлопчык;

д) счарнелая дошка;

е) перафарбаваны дом.

*4.Абазначце словазлучэнні з галоўным словам дзеепрыметнікам:*

а) засланы абрусам;

б) чыста засланы;

в) засланы ложак;

г) стомленая жанчына;

д) вельмі стомлены;

е) пачырванелы ад сораму.

*5.Адзначце сказы з дзеепрыметнымі зваротамі:*

а) Жанчына стаяла каля стала, засланага белым абрусам, налівала ў конаўку з вялікага гладыша малако;

б) Гарачыня неміласэрная: куды ні зірні – усё жоўтае, выпаленае сонцам;

в) Цёмныя гмахі камяніц з асветленымі вокнамі загароджвалі далягляд;

г) Люблю хадзіць па ўсланых лісцем дарожках купалаўскага сквера;

д) Праз завешанае коўдрай акно прабіваліся першыя промні сонца.

*5.Адзначце сказы, у якіх дзеепрыметныя звароты трэба выдзеліць коскамі:*

а) На таку ляжала прыкрытае саломай новае жыта;

б) Паляна акружаная з усіх бакоў цёмнай сцяной лесу млела ад гарачыні;

в) Прасеяныя скрозь іней сонечныя промні нясмела ўсплылі на шырокае крэсла;

г) Узрушаны і выведзены з раўнавагі старшыня грозна ўшчувае крыкуноў;

д) Дзядзька Пракоп павязаны наўскасяк ручніком вылез з-за стала амаль першым.

LIVEWORKSHEETS